# Стартаваў відэапраект «DEEPлом»

24.07.2024 17:23 | Моладзь

**Новае ток-шоу ад студэнтаў факультэта журналістыкі распрацавана і рэалізоўваецца як адукацыйны праект пры ўзаемадзеянні інфармацыйнага агенцтва «Минск-Новости», факультэта журналістыкі БДУ і Беларускага саюза журналістаў. Першы выпуск ужо даступны на You-Tube-канале агенцтва «Минск-Новости».**



Мэта праекта — стварыць адкрытую платформу для камунікацыі, якая паспрыяе свабоднаму і плённаму дыялогу моладзі з прызнанымі экспертамі ў розных галінах. У кожным выпуску будуць абмяркоўвацца актуальныя пытанні шырокага спектру тэм: ад сацыяльна-палітычных праблем да гістарычных падзей, эканамічных тэндэнцый і навуковых дасягненняў. Паводле слоў дэкана факультэта журналістыкі Аляксея Бяляева, ідэя ток-шоу ўзнікла пад уражаннем ад праекта «Напрамую» з удзелам рэктара БДУ Андрэя Караля.

> Дэкан падкрэсліў, што назва «DEEPлом» адлюстроўвае глыбінную накіраванасць праекта, задача якога — усебакова раскрываць абраныя для дыялогу тэмы.

Прэм'ерны выпуск ток-шоу быў прысвечаны малавядомым фактам пра Мінскае падполле. Гледачы даведаліся, колькі гадоў прайшло, перш чым Мінск быў удастоены звання «Горад-герой», а таксама пазнаёміліся з асобамі, якія стаялі на чале Ваеннай рады партызанскага руху. Вядучым першага выпуску стаў Андрэй Крывашэеў — дэпутат Мінгарсавета, генеральны дырэктар агенцтва «Минск-Новости».

> Экспертамі выступілі: гісторык, дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей Бяляеў; старшыня беларускага таварыства «Знание», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Вадзім Гігін і гісторык, публіцыст, дэпутат парламента Вячаслаў Даніловіч. Гасцямі прэм'ернага выпуску былі прадстаўнік пракуратуры горада Мінска Аляксей Валынец, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей Клішэвіч і старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Мікіта Рачылоўскі.

Здымкі ток-шоу праходзілі ў тэлевізійным павільёне БДУ. Студэнты другога і трэцяга курсаў факультэта журналістыкі ўдзельнічалі ва ўсіх этапах вытворчасці: ад напісання сцэнарыя да аператарскай работы і рэжысуры. Падчас карпатлівых пошукаў у архівах удалося знайсці ўнікальную інфармацыю і малавядомыя даныя, якія раней не былі агучаны на шырокую аўдыторыю.

***Дарэчы, ужо вядзецца работа над другім выпускам. Сумеснымі намаганнямі Міністэрства інфармацыі і кіраўніцтва БДУ «DEEPлом» можа стаць пастаянным студэнцкім ток-шоу.***